Искусство может и должно быть признано в своем роде явлением духовной жизни общества, благодаря которому как бы безгранично расширяются возможности человеческого общения на индивидуальном и личностном уровне. И если общение в процессе воспитания выступает как основной его признак, то непосредственно эстетическое воспитание происходит исключительно в процессе общения как единственного механизма взаимодействия воспитателя и воспитуемого. Культура чувств, высокий уровень эмоционально-психологической деятельности личности формируются только в процессе человеческого общения.

---

1. *Каган М.С.* Мир общения: проблемы межсубъективных отношений. – М.: Искусство, 1988. – С. 310.

2. *Леонтьев А.Н.* Проблемы развития психики. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1981.

**М.Л.Кузьмініч**, *дацэнт*

## МУЗЫЧНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Развіццё музычнага мастацтва, разнастайных формаў музычнай культуры, пашырэнне гастрольна-канцэртнай дзейнасці, выданне спецыяльных часопісаў, навуковай і вучэбна-метадычнай літаратуры, развіццё музычных інтарэсаў і патрэбнасцей слухачоў – усё гэта спрыяла фарміраванню сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі ў еўрапейскім грамадстве XIX – пачатку XX ст. як важнага сацыяльна-культурнага інстытута.

У гэты час адкрываюцца кансерваторыі, акадэміі, вышэйшыя музычныя школы, каледжы, ліцэі. Яны адрозніваліся па задачах, якія вырашалі, метадах навучання, і часта тая ці іншая ўстанова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спалучала падрыхтоўку прафесіяналаў і аматараў, дарослых і дзяцей, выканаўцаў, педагогаў, тэарэтыкаў і кампазітараў.

Арганізацыя сістэмы дзяржаўнай музычнай адукацыі ў Францыі адносіцца да перыяду Вялікай французскай рэвалюцыі. У 1793 г. аб'ядналіся Каралеўская школа спеваў і дэкламацыі, якая існавала пры тэатры «Каралеўская акадэмія музыкі» з 1784 г., і музычная школа Нацыянальнай гвардыі (адкрыта ў 1792 г.). Яны ўтварылі Нацыянальны музычны інстытут, які рашэннем Канвента быў перайменаваны ў 1795 г. у Кансерваторыю музыкі і дэкламацыі [1].

Парыжская кансерваторыя стала еўрапейскім цэнтрам музычнай педагогікі. Тут вучылі іграць на ўсіх традыцыйных музычных інструментах, а таксама спевам, драматычнаму мастацтву, вывучалі гісторыю музыкі. Цэнтральным у падрыхтоўцы музыкантаў лічыўся курс сальфеджыо. Вядучае месца ў першыя гады дзейнасці ўстановы займалі класы духавых інструментаў [2]. Педагогі кансерваторыі, як правіла, з'яўляліся віртуозамі-выканаўцамі, пастаянна ўдасканальвалі музычныя інструменты, стваралі метадычныя дапаможнікі і настаўленні і тым самым уплывалі на далейшае развіццё аркестравага і канцэртнага выканання. Яны сумяшчалі педагагічную працу з выканальніцкай і паспяхова выступалі ў складзе лепшых парыжскіх аркестраў.

У 1828 г. было створана Таварыства канцэртаў Парыжскай кансерваторыі. Яно займалася арганізацыяй канцэртаў у кансерваторыі і ў оперных тэатрах горада. Пры кансерваторыі таксама дзейнічалі друкарня і нотны магазін. Гэта музычная навучальная ўстанова стала арганізацыйна-метадычным і навукова-даследчым цэнтрам у сістэме музычнай адукацыі Францыі. Яна мела філіялы ў Лілі (1810) і Тулузе (1826), Нансі, Ліёне, курыравала дзейнасць шэрага сярэдніх навучальных устаноў. У 1861 г. пры кансерваторыі быў створаны музей музычных інструментаў.

«Другой кансерваторыяй» Парыжа ў канцы XIX ст. называлі Schola cantorum (1894) – вышэйшую музычную навучальную ўстанову, якая стала цэнтрам вывучэння і прапаганды стара-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

даўняй свецкай і царкоўнай музыкі. Яс заснаваў і звыш 30-ці гадоў узначальваў В.д'Эндзі, які ў сваёй дзейнасці захоўваў творчыя традыцыі і мастацка-педагагічныя прынцыпы свайго настаўніка – французскага кампазітара, арганіста і педагога, прэзідэнта (з 1886 г.) Нацыянальнага музычнага таварыства С.Франка.

Услед за Парыжскай адкрыліся кансерваторыі ў Празе (1811), Варшаве і Вене (1821), Лондане (1822), Мадрыдзе (1830), Пешце (Будапешце, 1840), Лейпцыгу (1843), Барселоне (1847), Берліне і Кёльне (1850) і іншых гарадах Еўропы.

Вена к пачатку XIX ст. справядліва лічылася адным з самых значных цэнтраў еўрапейскага музычнага мастацтва. Тут у 1812 г. аматары мастацтва на прыватныя сродкі ўтварылі Таварыства сяброў музыкі, якое арганізоўвала музычныя фестывалі і наогул усё канцэртнае жыццё аўстрыйскай сталіцы. У 1817 г. Таварыства заснавала пеўчую школу, якая пазней (1821) была пераўтворана ў Венскую кансерваторыю.

Важнымі кірункамі дзейнасці кансерваторыі былі культурна-асветніцкая работа, супрацоўніцтва з музычнымі таварыствамі і канцэртнымі арганізацыямі, напрыклад венскімі Канцэртхаўзам, Музікферайнам, якія арганізоўвалі канцэрты, складалі праграмы Венскага фестывалю. З 1869 г. кансерваторыя размяшчалася ў будынку Музікферайна, а потым у прыбудове да будынка Канцэртхаўза. У гэты час яна рыхтавала прафесійных спевакоў і інструменталістаў. У 1908 г. кансерваторыя атрымала статус Дзяржаўнай вышэйшай навучальнай установы і была перайменавана ў Акадэмію музыкі і відовішчных мастацтваў.

Акрамя кансерваторыі, у Вене працавалі і іншыя музычныя навучальныя ўстановы. Цэнтрам еўрапейскага музыказнаўства лічыўся і Венскі універсітэт, у якім выкладаліся музычна-тэарэтычныя дысцыпліны, у тым ліку музычная крытыка [3].

У Варшаве з 1814 г. прафесійных музыкантаў рыхтавала Драматычная школа, якую заснаваў Юзэф Эльснер (1769–1854). У 1816 г. ён рэарганізаваў Драматычную школу ў Школу музыкі і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

драматычнага мастацтва, а ў 1821 г. на базе факультэта прыгожых мастацтваў Варшаўскага універсітэта па яго праекце быў заснаваны Інстытут музыкі і дэкламацыі з трыма аддзяленнямі – вакальным, інструментальным і тэарэтыка-кампазітарскім. Інструментальнае аддзяленне называлася кансерваторыяй, а тэарэтыка-кампазітарскае – галоўнай школай музыкі, якая ўваходзіла ў склад Варшаўскага універсітэта на правах факультэта Ю.Эльснер у гісторыю музычнай педагогікі ўвайшоў яшчэ і таму, што падрыхтаваў вялікую колькасць музыкантаў, сярод якіх сусветна вядомы польскі піяніст і кампазітар Ф.Шапэн [4]. У 1861 г. Інстытут музыкі і дэкламацыі быў пераўтвораны ў Музычны інстытут. Яго ўзначаліў вядомы польскі скрыпач, кампазітар, дырыжор і грамадскі дзеяч Апалінарый Концкі (1825–1879).

Сярод музычных цэнтраў Еўропы XIX ст. вылучаўся Лондан. Каралеўская акадэмія музыкі ў Лондане ўзнікла ў 1822 г. на сродкі мецэнатаў як прыватная школа, з 1832 г. атрымала статус Каралеўскай акадэміі музыкі. Кіраванне ўстановай забяспечвалі дырэктар, савет прафесараў і выканаўчы камітэт. У склад педагогаў акадэміі ўваходзілі вядомыя ў Еўропе кампазітары і выканаўцы. У канцэртнай зале ўстановы, пабудаванай у 1912 г., рэгулярна праходзілі канцэрты студэнтаў.

У другой палове XIX ст. у Вялікабрытаніі адкрыліся Трыніці-каледж (1872), Каралеўскі музычны каледж (1883) і іншыя навучальныя ўстановы.

На працягу XIX ст. музычныя навучальныя ўстановы актыўна ствараліся і ў Берліне. Гэта школа спеваў (1804), музычная школа (1820), пераўтвораная ў 1822 г. у Інстытут па падрыхтоўцы арганістаў і школьных настаўнікаў музыкі, а ў 1875 г. – у Каралеўскі інстытут царкоўнай музыкі (сёння існуе ў складзе Вышэйшай школы музыкі) і інш.

Першая музычная ВНУ, Лейпцыгская кансерваторыя, узнікла ў Германіі ў 1843 г. Тут рыхтаваліся кадры высокакваліфікаваных прафесіяналаў – музыкантаў-педагогаў, аркестрантаў, ансамблістаў, канцэртмайстраў, дырыжораў, якія павінны былі забяспе-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

чыць высокі ўзровень і шырокае распаўсюджанне музычнай культуры ў краіне. З заснаваннем кансерваторыі Лейпцыг стаў буйным навуковым і метадычным цэнтрам у галіне музычнага мастацтва.

Часцей за ўсё новыя музычныя навучальныя ўстановы ў краінах Еўропы ў XIX ст. стваралісяпры музычных таварыствах. Спачатку гэта былі школы, каледжы, ліцэі, якія з цягам часу пераўтвараліся ў вышэйшыя школы, акадэміі, інстытуты і, нарэшце, у дзяржаўныя кансерваторыі. Так, у Неапалі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. аб'ядналіся чатыры кансерваторыі, заснаваныя яшчэ ў XVI ст., і ў 1806 г. утварылі Каралеўскі музычны каледж (пазней – Каралеўскую кансерваторыю Сан-П'етра а Майела). У Венецыі ў XVIII ст. пасля двухсот гадоў існавання закрыліся аспедале – аналагі першых неапалітанскіх кансерваторый. У 1877 г. пры таварыстве «Бенедзета Марчэла» быў адкрыты музычны ліцэй, які з 1895 г. стаў дзяржаўным, у 1916 г. атрымаў статус вышэйшай школы (з 1940 г. Дзяржаўная кансерваторыя імя Бенедзета Марчэла). У Балоньі ў 1804 г. таксама адкрыўся музычны ліцэй, які ў 1914 г. атрымаў статус кансерваторыі (з 1942 г. – Дзяржаўная кансерваторыя).

У XIX ст. паспяхова дзейнічала адна са старэйшых музычных навучальных устаноў Італіі – Рымская акадэмія. Яна была заснавана яшчэ ў 1566 г. як таварыства музыкантаў, у 1839 г. атрымала назву «Санта-Чэчылія». У 1876 г. пры ёй адкрыўся музычны ліцэй (з 1919 г. – кансерваторыя Санта-Чэчылія). Гэтая ўстанова аб'ядноўвала акадэмію, кансерваторыю, сімфанічны аркестр, музычную бібліятэку, музей музычных інструментаў. Пры кансерваторыі дзейнічалі курсы ўдасканалення для выпускнікоў па розных спецыяльнасцях і цэнтр па вывучэнні народнай музыкі. У 1895 г. у будынку акадэміі была адкрыта канцэртная зала, у якой праходзілі харавыя, камерныя, арганныя і сольныя канцэрты з удзелам італьянскіх і замежных артыстаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У XIX ст. статус кансерваторыі набылі музычныя навучальныя ўстановы, якія існавалі ў Жэневе (1835), Бруселі (1832), Лісабоне (1836), Мюнхене (1846), Дубліне (1848) і інш.

У другой палове XIX ст. працэс адкрыцця новых кансерваторый у Еўропе паскорыўся. Музычныя навучальныя ўстановы ўзніклі ў Дрэздэне (1856), Пецярбургу (1862), Бухарэсце (1864), Люксембургу (1864), Маскве (1866), Капенгагене (1867), Турыне (1867), Базелі (1867), Хельсінкі (1882), Амстэрдаме (1884), Белградзе (1899) і іншых гарадах.

Далейшае развіццё атрымала музычная адукацыя ва універсітэтах. У Германіі, Аўстрыі і Швейцарыі яна абмяжоўвалася засваеннем пераважна музычна-тэарэтычных прадметаў і падрыхтоўкай музыказнаўцаў на музычных факультэтах. Вывучэнне практычных дысцыплін лічылася нелагічным, бо паступаючыя ў вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны ўжо быць добра падрыхтаванымі музыкантамі. Змест іх навучання складалі музыказнаўчыя і агульнаэстэтычныя прадметы. У той жа час у Вялікабрытаніі і ЗША ва універсітэтах вывучалі, акрамя музыказнаўчых дысцыплін, музычную педагогіку і практычныя прадметы.

Паралельна з заснаваннем навучальных устаноў у Еўропе працягвалася дзейнасць школ вышэйшага майстэрства, на чале якіх стаялі вядомыя ў Еўропе піяністы М.Клеменці, К.Чэрні, Ф.Шапэн, К.Таўзіг, Т.Лешаціцкі, скрыпачы А.В'ётан, Й.Іахім, Р.Крэйцар, дырыжоры Р.Вагнер, Г.Малер і іншыя музыканты. Адну з такіх школ узначальваў Ферэнц Ліст (1811–1886) – піяніст-віртуоз, дырыжор, педагог і кампазітар, які з пачатку 1850-х гадоў стаў на чале творчага аб'яднання нямецкіх кампазітараў і прадстаўнікоў мастацкай інтэлігенцыі так званай Веймарскай школы.

Педагагічная і музычна-асветніцкая дзейнасць Ф.Ліста прыцягвала з розных гарадоў Еўропы ў Веймар вялікую колькасць жадаючых удасканаліць сваё выканальніцкае майстэрства [5].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ліст прымаў таксама актыўны ўдзел у музычным жыцці Венгрыі, садзейнічаў адкрыццю ў 1875 г. акадэміі музыкі ў Пешце (Будапешце), быў яе прафесарам і першым прэзідэнтам.

Акрамя навучання ў кансерваторыях і іншых спецыяльных навучальных установах, шырока распаўсюджанай заставалася практыка атрымання прафесійнай музычнай адукацыі ў сям'і: набыццё прафесійных уменняў і навыкаў забяспечвалі бацькі-музыканты ці запрошаныя настаўнікі музыкі. Хатняя музычная адукацыя дапаўнялася вандроўкамі па музычных сталіцах Еўропы, урокамі, якія давалі знакамітыя музыканты – утрымальнікі школ вышэйшага майстэрства.

Такім чынам, разнастайнасць формаў атрымання прафесійнай музычнай адукацыі з'яўляецца характэрнай рысай падрыхтоўкі музыкантаў у разглядаемы перыяд ва ўсіх еўрапейскіх краінах. Пры гэтым дамінуючае становішча паступова займае тэндэнцыя да інстытуялізацыі прафесійнай музычнай адукацыі праз стварэнне вялікай колькасці музычных навучальных устаноў, распрацоўку тэхналогіі навучальнага працэсу, пастаяннае ўдакладненне яго зместу з улікам развіцця тэарэтычнага музыказнаўства і выканання, музычных інтарэсаў слухацкай аўдыторыі. Заснаваныя ў XIX – пачатку XX ст. музычныя навучальныя ўстановы былі цэнтрамі адукацыі, музычна-асветніцкай дзейнасці, займалі важнае месца ў еўрапейскай сацыяльна-культурнай прасторы.

---

1. *Кузьмініч М.Л.* Гісторыя музычнага выхавання і адукацыі (ад старажытнасці да XIX ст.). – Мн.: Бел. ун-т культуры, 2000. – С. 98–99.

2. *Левин С.Я.* Духовые инструменты в истории музыкальной культуры: В 2 ч.– Л.: Музыка, 1983. – Ч.2. – С. 21.

3. *Нелюбова Л.И.* Музыкальная культура Германии и Австрии рубежа XIX–XX веков.– Киев: Муз. Україна, 1990. – 168 с.

4. *Бэлза И.* Фредерик Францишек Шопен. – М.: Музыка, 1991. – 141 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Гнатюк Л.И.* Ф.Мендельсон и Лейпцигская консерватория // Ф.Мендельсон-Бартольди и традиции музыкального профессионализма: Сб. науч. тр. / Ин-т музыкознания; Сост. Т.И.Гинзбург. – Харьков, 1995. – С. 48–60.

6. *Алексеев А.Д.* История фортепианного искусства: В 3 ч. – Ч. 1 – 2. – 2-е изд., доп. – М.: Музыка, 1988. – С.213–233, 235–251.

**В.Г.Кухаренок,** *доцент*

## РАЗВИТИЕ ТВОРЧЕСКОЙ АКТИВНОСТИ МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ В ТЕАТРАЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Освоение детьми синтеза изобразительных и выразительных средств искусства помогает пробудить их творческую активность, вызывает желание к преобразованию своих действий. Объясняется это тем, что искусство воздействует на эмоциональную сферу ребенка, вызывает стремление познать окружающий мир. Однако реальная практика современной школы слабо ориентирована на развитие творческих способностей младших школьников, особенно с использованием воспитательного потенциала искусства.

Для работы с младшими школьниками театральная деятельность является наиболее приемлемой, ибо опыт и уровень знаний ребенка, еще невелик и развитие целостной творческой личности вне общения с искусством невозможно.

Оптимальные условия для эмоционального восприятия и переживания образа и в дальнейшем максимального выражения себя в художественном творчестве создаст синтез нескольких видов искусства, стимулируя фантазию и творческую активность ребенка, которому в данном возрасте недостаточно созерцательного общения с искусством. Необходимо выражение себя в художественной творческой деятельности. Оптимальным сочетанием восприятия и художественной творческой деятельности характери-